# Метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні ў адукацыйным працэсе дыдактычных матэрыялаў па літаратурным чытанні для IV класа

Дыдактычны матэрыял па літаратурным чытанні для IV класа распрацаваны з улікам пераемнасці і перспектыўнасці навучання на першай ступені агульнай сярэдняй адукацыі і прызначаны для практычнай рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу ў адукацыйным працэсе. У адпаведнасці з кампетэнтнасным падыходам вучэбны прадмет "Літаратурнае чытанне" забяспечвае фарміраванне *чытацкай граматнасці* вучняў для асэнсаванага ўспрымання пісьмовай тэкставай інфармацыі на беларускай мове і асобаснага ўспрымання твораў мастацкай літаратуры.

Чытацкая граматнасць — гэта здольнасць чалавека разумець і выкарыстоўваць пісьмовыя тэксты, разважаць пра іх і займацца чытаннем для таго, каб дасягаць сваіх мэт, пашыраць веды і магчымасці, удзельнічаць у сацыяльным жыцці. Актуальнасць фарміравання чытацкай граматнасці пацвярджаюць вынікі міжнародных даследаванняў PIRLS і PISA.

Чытацкая граматнасць вучняў агульнаадукацыйнай школы звязана са здольнасцю да чытання і разумення вучэбных тэкстаў рознай функцыянальнай накіраванасці і розных жанраў; з уменнем здабываць інфармацыю з тэксту, інтэрпрэтаваць і выкарыстоўваць яе пры вырашэнні вучэбных і вучэбна-практычных задач, а таксама ў паўсядзённым жыцці [1]. Чытацкая граматнасць мае метапрадметную прыроду і фарміруецца ў працэсе навучання ўсім вучэбным прадметам, але ў першую чаргу гэта адбываецца на ўроках літаратурнага чытання.

Для паспяховага фарміравання чытацкай граматнасці, лепшага засваення ўсіх вучэбных прадметаў, для самаадукацыі і самаразвіцця вучняў былі распрацаваны дыдактычны матэрыял па літаратурным чытанні ў IV класе, які прадугледжвае авалоданне такімі чытацкімі ўменнямі, што забяспечаць вучням магчымасць самастойна набываць новыя веды, знаходзіць неабходную інфармацыю для дасягнення жыццёвых мэт.

Дыдактычны матэрыял уключае мастацкія тэксты і заданні, якія маюць кампетэнтнасна-арыентаваны характар. Творы разнастайныя па тэматыцы: пра жыццё дзяцей і дарослых; узаемаадносіны дзяцей у калектыве і сям'і; працу людзей; стаўленне людзей адзін да аднаго; павагу, клопат, удзячнасць да старэйшых; пра Радзіму. Тэксты невялікія па аб'ёме, інфармацыйна насычаныя, адлюстроўваюць рэальныя жыццёвыя сітуацыі, забяспечваюць інтэлектуальнае і эстэтычнае развіццё вучняў.

Асноўныя крытэрыі да адбору матэрыялаў — адпаведнасць узроставым асаблівасцям чацвёртакласнікаў, іх чытацкім і жыццёвым інтарэсам. Заданні разлічаны не на механічную работу (па ўзоры), а на актыўную разумовую дзейнасць дзяцей.

Дыдактычны матэрыял адрасаваны настаўнікам пачатковых класаў і з'яўляецца дадатковым кампанентам ВМК па літаратурным чытанні для IV класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання.

Заданні могуць быць выкарыстаны на ўроках літаратурнага чытання з мэтай фарміравання канкрэтных чытацкіх уменняў, для праверкі ўзроўню сфарміраванасці чытацкіх уменняў, арганізацыі самастойнай работы вучняў на ўроках абагульнення, а таксама на стымулюючых і падтрымліваючых занятках, падчас індывідуальнай работы ў дамашніх умовах.

Для арганізацыі працы з дыдактычным матэрыялам на ўроках літаратурнага чытання настаўнік рыхтуе раздатачны матэрыял — бланкі для выканання заданняў усімі вучнямі класа. Можа быць арганізавана як індывідуальная, так і франтальная работа. Пры неабходнасці настаўнік дае дадатковыя тлумачэнні па выкананні заданняў тым вучням, у якіх узнікаюць цяжкасці пры іх асэнсаванні.

Прывядзём прыклады.

### Чарніцы

Народная прыкмета кажа: "Калі шмат мух — тады шмат і чарніц". А мне здаецца, што чарніц заўжды багата ў нашым лесе. Гэтыя цёмнасінія, з шызым налётам ягады, бадай, ведае кожны. Яны растуць на нізкіх кусціках з дробным лісцем. А галінкі такія шчодрыя — аж вочы разбягаюцца. Міжволі тут прысядзеш або ўкленчыш і давай — па ягадцы, па дзве, як ужо налаўчыўся. Калі ж надумаўся прыйсці дамоў з поўным вядром, ніяк не абысціся без добрае парады: "Адной рукой дзіця не няньчаць і ягад не збіраюць".

Дарэчы, зусім няцяжка прыкмеціць: з усіх ягаднікаў чарнічнік найбольш раскашуе ў лесе, на многія кіламетры раскінуліся яго ўладанні. І ў сасновым бары, і ў ельніку, і нават у гаі пад лісцянымі дрэвамі. Быццам хтосьці ці штосьці чарніцам спрыяе. Ні сухмені яны не баяцца, ні змрочнага ценю...

А ўся адгадка, мабыць, у старадаўняй легендзе.

Калісьці вельмі-вельмі даўно людзі давedаліся, што ў Лесавіка ёсць дзівосныя скарбы, і згаварыліся імі завалодаць. Усе лясы і пушчы перакапалі, шукаючы незлічоныя багацці, шмат векавых дрэў павалілі ды пусцілі з дымам. Не стала куды прытуліцца беднаму Лесавіку. Пашкадаваў небараку кусцік чарнічніку. Ён не збаяўся, што таксама можа пацярпець, схаваў ляснога ўладара і яго скарбы пад сваімі галінкамі. Людзі ледзь не спраўдзілі задуманае, але не звярнулі ўвагі на маленькія кусцікі побач з магутнымі ялінамі і соснамі.

З таго часу ў знак вялікай удзячнасці Лесавік аж па сённяшні дзень апякуе чарніцы, самаручна рассяляе чарнічнік па неабдымных лясных абшарах.

Што ж, чарніцы вартыя такой пашаны. Думаю, са мной усе пагодзяцца. Лесавіковы ягады цудоўныя на смак і карысныя для здароўя. Любыя — свежыя, сушаныя, звараныя. Але асабліва мне падабаюцца варэнікі з чарніцамі. Цэлую талерку, ды яшчэ з горкаю, з'ясі і зноў папросіш.

*У. Ягоўдзік.*

**1.** Знайдзі і падкрэслі ў тэксце апісанне чарніц. Адзнач малюнак, на якім адлюстраваны чарніцы.






**2.** Абапіраючыся на змест апавядання, адзнач, у якіх мясцінах можна натрапіць на чарнічнік.
А. У гаі
Б. Каля лясных дарог і сцежак
В. На светлых палянах
Г. У сасновым бары
Д. У ельніку

**3.** У тэксце сцвярджаецца, што чарнічнік можна сустрэць у лесе даволі часта. Як правіла, ён займае вялікую плошчу. На думку аўтара, з чым гэта звязана?

______

**4.** Абапіраючыся на тэкст, адкажы, у якім выглядзе можна ўжываць чарніцы. Запішы адказ.

______

**5.** Дакажы, што аўтар тэксту любіць паласавацца чарніцамі.

______

**6.** Што абазначае выраз *аж вочы разбягаюцца*?
А. Вочы глядзяць у розныя бакі
Б. Вельмі хочацца спаць
В. Цяжка сканцэнтраваць позірк на чым-небудзь ад разнастайнасці ўражанняў
Г. Не хочацца глядзець

**7.** У старадаўняй легендзе расказваецца, што людзі шукалі Лесавіка. Чаму яны гэта рабілі? Адзнач правільны адказ.
А. Хацелі папрасіць у Лесавіка ягад
Б. Ведалі, што ў Лесавіка ёсць дзівосныя скарбы
В. Думалі, што Лесавік зможа расказаць цікавыя гісторыі пра лес
Г. Хацелі, каб Лесавік паказаў ім, дзе растуць чарніцы

8. Чаму, паводле легенды, Лесавік апякае чарніцы?

А. Ягады падабаюцца Лесавіку на смак
Б. Куст чарнічніку схаваў Лесавіка ад людзей
В. Людзі вельмі любяць чарніцы
Г. Куст чарнічніку спадабаўся Лесавіку знешне

9. Дакажы, што куст чарнічніку пры сустрэчы з Лесавіком быў смелы. Выпішы адказ з тэксту.

______________________________

10. Чаму аўтар называе чарніцы "лесавіковы ягады"? Запішы адказ.

______________________________

11. Прывядзі два доказы таго, што чарніцы вартыя пашаны.

1) ______________________________
2) ______________________________

12. Растлумач, як ты разумееш сэнс прымаўкі *Адной рукой дзіця не няньчаць і ягад не збіраюць.*

______________________________

13. Два вучні атрымалі на ўроку заданне апісаць знешні выгляд і выкарыстанне чарніц. Прачытай адказ кожнага з іх і знайдзі той, у якім дапушчана памылка. Адзнач няправільнае апісанне.

☐ **Максім.** Чарніцы — гэты ягады чорнага колеру з шызым налётам. Растуць яны на вялікіх кусціках, якія маюць вострыя калючкі. Чарнічнік можна заўважыць толькі на балоцістых лагчынах і лугавінах. Чарніцы карысныя для здароўя.

☐ **Алеся.** Чарніцы — гэты ягады цёмна-сіняга колеру з шызым налётам. Растуць яны на нізкіх кусціках з дробнымі лісцікамі. Расце чарнічнік вялікімі зараснікамі ў хвойніках, ельніку і ялова-шыракалістых лясах. Ягады чарніц ужываюць у ежу. Яны карысныя для здароўя.

### Кампот

Маленькая Галя вельмі любіць памагаць маме. Сёння мама даручыла Галі памыць сушаныя яблыкі для кампоту. За абедам мама сказала: «Ну, цяпер пакаштуем кампот нашай дачушкі», — і паставіла перад кожным кубак, а перад Галяй — яе любімы, з дзвюма чырвонымі вішанькамі.

Тата адпіў крыху з кубка і зірнуў на маму. Мама зрабіла глыток і паглядзела на Галю. Паглядзела і пытаецца: «Дачушка, ці добра ты памыла яблыкі?» — «Так, мамачка, — адказала Галя, — вельмі добра. Я іх нават мылам мыліла!»

*К. Каліна.*

1. Якое даручэнне дала мама дачцэ? Адзнач правільны адказ.

А. Зварыць кампот
Б. Памыць сушаныя грушы
В. Памыць сушаныя яблыкі
Г. Падрыхтаваць прадукты для прыгатавання кампоту
Д. Парэзаць яблыкі

2. Чаму тата з мамай пераглянуліся? Запішы.

______________________________

3. Ці добра Галя памыла яблыкі? Адказ абгрунтуй.

______________________________

4. Якую параду ты можаш даць дзяўчынцы?

______________________________

5. Падкрэслі ў тэксце сказ, які пацвярджае, што ў бацькоў расце гаспадарлівая дачка.

6. Як ты думаеш, што спатрэбіцца для прыгатавання кампоту? Адзнач адпаведныя прадукты.

А. Цукар
Б. Сок
В. Сушаныя яблыкі
Г. Вада
Д. Соль
Е. Алей

7. Уяві, што цябе папрасілі расказаць, як трэба варыць кампот. Запішы свой адказ.

______________________________

*ЛІТАРАТУРА*

1. Александрова, О. М. Формирование читательской грамотности учащихся основной школы : метод. рекомендации / О. М. Александрова [и др.] // Русский язык в школе. — 2017. — № 1. — С. 3—12.
2. Чытанка для ласуноў : для дзяцей мал. шк. узросту / уклад. І. Бутарына ; маст. К. Задворны. — Мінск : Звязда, 2016. — 168 с. — С. 49—50.

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
**дацэнт кафедры беларускага і рускага мовазнаўства факультэта пачатковай адукацыі БДПУ імя М. Танка, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.**



*На дыску — дыдактычны матэрыял для IV класа.*